*Кузьмініч Т.В., Саітава В.І.* (Мінск)

# ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ БІБЛІЯГРАФІІ Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ

Беларуская бібліяграфія на працягу стагоддзяў забяспечвала інтэлектуальны доступ нацыянальнага згуртавання да розных крыніц інфармацыі. Яна развівалася як у кантэксце сусветнай бібліяграфіі, так і пад уплывам асаблівасцей развіцця нацыянальнай гісторьті, культуры, адукацыйных і навуковых сістэм, а таксама гісторыі і культуры краін і дзяржаўных утварэнняў, часткай якіх станавіліся беларускія землі.

У гісторыка-бібліяграфічных работах (В.Е. Лявончыкаў, І.Б. Сіманоўскі) перыядызацыю беларускай бібліяграфіі суадносілі з асноўнымі этапамі сацыяльна-палітычнага развіцця Беларусі [1]. На наш погляд, зыходнымі кропкамі перыядызацыі павінны быць асноўныя ўласна бібліяграфічныя з'явы: развіццё арганізацыйных структур, відаў бібліяграфіі, навуковай і адукацыйнай бібліяграфічнай дзейнасці. Іх з'яўленне, а затым развіццё, стабілізацыя, змяненні дазваляюць не толькі акрэсліць храналагічныя перыяды беларускай бібліяграфіі, але і абгрунтаваць кожны з іх з улікам яе самастойнай унутранай развітасці, а таксама ўздзеяння на яе знешняга асяроддзя, канкрэтных гісторыка-культурных і іншых фактараў, якія абумоўліваюць дынамізм асобных бібліяграфічных сістэм.

Ідэнтыфікацыя з'яў, што адносіліся да беларускай бібліяграфіі ў той ці іншы перыяд часу, і, адпаведна, правільнае абгрунтаванне перыяду яе развіцця, вылучэнне якога-небудзь этапу - даволі складаная задача. З прычыны асаблівасцей развіцця краіны як нацыянальнай дзяржавы ў шэрагу гістарычных перыядаў патрэбна ўлічваць не столькі сучасныя дзяржаўныя межы Беларусі, колькі тэрыторыі канкрэтна гістарычныя і этнічныя, населеныя беларусамі. Такі падыход правамерны пры ідэнтыфікацыі першых дакументаваных з'яў беларускай бібліяграфіі ў старажытных княствах, на беларускіх землях у складзе Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ), Рэчы Паспалітай, Расійскай Імперыі і іншых дзяржаўных утварэнняў. Дзяржаўна-тэрытарыяльны прынцып у спалучэнні з этнічным дазваляе поўна ахапіць з'явы беларускай бібліяграфіі ў перыяды Савецкага Саюза і Рэспублікі Беларусь.

Пры вызначэнні этапаў развіцця беларускай бібліяграфіі важна ўлічваць гісторыка-бібліяграфічныя факты (факты-падзеі, навуковыя факты, факты-крыніцы), якія ў сукупнасці сваёй дазваляюць скарэкціраваць перыядызацыю бібліяграфіі адносна перыядызацыі гісторыі краіны, вылучыць у рамках асобных перыядаў асноўныя этапы і знакавыя з'явы. Аднак існуюць цяжкасці як з выяўленнем падобных фактаў, так і з вызначэннем іх як нацыянальных. Гэта звязана з шэрагам прычын, абумоўленых асаблівасцямі гістарычнага развіцця Беларусі:

- працяглым знаходжаннем беларускіх зямель у межах дзяржаўных утварэнняў другіх нацый з дамінаваннем, на жаль, іншых культур у сістэмах дакументных камунікацый;
- значным разыходжаннем этнічных і тэрытарыяльна-дзяржаўных меж;
- шматлікімі разбуральнымі войнамі, дзе гінулі, знікалі бясследна, станавіліся ўласнасцю іншых краін бібліятэкі, кніжныя калекцыі, у выніку якіх «перакройваліся» беларускія землі і знішчаліся арганізацыйныя структуры бібліяграфіі;
- працяглай дзяржаўнай дыскрымінацыяй беларускай мовы (аж да поўнай забароны друкаваць любога роду літаратуру на беларускай мове);
- наяўнасцю і супрацьстаяннем розных рэлігійных канфесій;
- вымушанай эміграцыяй (з канца XVIII ст.) часткі насельніцтва з беларускіх зямель і дастаткова хуткай асіміляцыяй з другімі народамі;
- наяўнасцю моцных гістарычных навуковых школ у сумежных дзяржавах, з якімі Беларусь уваходзіла ў агульныя дзяржаўныя ўтварэнні або ў якія ўліваліся беларускія землі. Сіламі прадстаўнікоў гэтых школ ствараліся і распаўсюджваліся неаб'ектыўныя погляды на беларускую нацыю і яе культуру.

З улікам вышэйпададзенага можна вылучыць наступныя асноўныя перыяды ў развіцці беларускай бібліяграфіі: 1)зараджэнне беларускай бібліяграфіі і развіццё да другой паловы XVI ст.; 2) другая палова XVI ст. - 1830-ягг.; 3) 1830-я - 1920-я гг.; 4) 1920-ягг. - 1941 г.; 5) 1941 г. - 1950-я гг.; 6) 1960-я - 1980-я гг.; 7) з 1990-х гг. да цяперашняга часу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Першы перыяд ахоплівае прыкладна пяць стагоддзяў. Вызначыць пачатак адліку беларускай бібліяграфіі немагчыма, прытчым незалежна ад таго, ці ўключаем мы ў аб'ект разгляду бібліяграфічныя (ідэнтыфікацыйныя) элементы дакументаў або толькі постэдыцыйныя формы бібліяграфіі. У прымяненні да беларускай бібліяграфіі можна гаварыць толькі аб нязначнай колькасці апісаных у іншых крыніцах і радзей захаваных дакументаў, бібліяграфічных матэрыялаў. У гэты перыяд на беларускіх землях існавалі ўдзельныя княствы, на аснове якіх была сфарміравана моцная феадальная дзяржава - Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае.

У XI—XII стст. пачалося фарміраванне пісьмовай беларускай кніжнай культуры. Імёны такіх дзеячаў хрысціянскай кніжнай культуры, як Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, вядомы ўсяму цывілізаванаму свету. Іх дзейнасць - сведчанне таго, што кніжная культура старажытных беларускіх княстваў не ўступала ўзроўню іншых еўрапейскіх рэгіёнаў. Можна меркаваць, што ў межах агульнаеўрапейскіх тэндэнцый развіваўся і бібліяграфічны складальнік як яе неад'емная частка. Але, на жаль, звестак аб стварэнні крыніц бібліяграфічнай інфармацыі да другой паловы XV ст. няма.

У гэты перыяд разам з актыўным фарміраваннем кніжных збораў розных рэлігійных канфесій, прыватных кніжных калекцый беларускіх магнатаў, прадстаўнікоў духавенства, шляхты стваралася каталожная бібліяграфічная інфармацыя, складвалася яе тэрміналогія. Састаўляліся рэгістры, рэестры, інвентары, у якіх кніга ўлічвалася як матэрыяльны аб'ект (часам разам з другімі каштоўнасцямі). З пачаткам кнігадрукавання (першая трэць XVI ст.) былі ўдасканалены ідэнтыфікацыйныя элементы дакумента (Ф. Скарына стаў афармляць тытульныя лісты) і створаны бібліяграфічныя матэрыялы да тэкстаў выданняў (Ф. Скарына, В. Цяпінскі і інш.). У ліку аб'ектаў бібліяграфавання разам з рукапіснымі дакументамі з'явілася друкаваная кніга, прычым для бібліяграфічных матэрыялаў, створаных на беларускіх землях, характэрна адлюстраванне зарубежных дакументальных крыніц.

Функцыянаванне бібліяграфічнай інфармацыі ва ўсіх грамадскіх інстытутах сістэмы дакументных камунікацый, што існавалі ў той час, выяўляла характэрную для яе арганізацыйную раздробленасць. Калі сам гэты факт няўхільна сведчыць аб выкананні бібліяграфіяй свайго назначэння, то істотным недахопам была адсутнасць самастойна выдадзеных бібліяграфічных паказальнікаў (хоць параўнанне праводзіцца з нямецкімі дзяржавамі, лідарамі бібліяграфавання друкаванай кнігі).

Гэты перыяд быў дастаткова плённы для развіцця нацыянальнай культуры: на старабеларускай мове вялося справаводства, друкаваліся кнігі, развіваліся рэфарматарскія плыні. Умацаванне і развіццё гэтых пазіцый у перспектыве магло б забяспечыць даволі моцныя імпульсы для развіцця беларускай бібліяграфіі, што па аналогіі можна прасачыць у шэрагу еўрапейскіх краін.

На жаль, сацыяльна-палітычныя ўмовы развіцця ВКЛ склаліся так, што ўзмацніўся польскі культурны і палітычны ўплыў, беларускамоўная кніга ўступіла свае пазіцыі польскамоўнай, іншамоўная кніга заняла асноўныя сферы спажывання дакументальна фіксаваных ведаў [2].

З другой паловы XVI ст. да 1830-х гг. бібліяграфія на беларускіх землях развівалася ва ўмовах уваходжання іх у склад канфедэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай, а пасля 1794 г. - Расійскай Імперыі. Абгрунтаваннем гістарычнага перыяду, што прапануецца, з'яўляюцца гісторыка-бібліяграфічныя факты, якія маюць блізкі характар. У абедзвюх дзяржавах асаблівы ўплыў на развіццё бібліяграфіі аказвалі пераўтварэнні ў адукацыйных сістэмах, удасканаленне бібліятэчнай справы. працэсы дыферэнцыяцыі навуковых ведаў, у меншай ступені - развіццё кнігавыдавецкай і кнігагандлёвай дзейнасці. У рамках гэтага перыяду можна вылучыць два этапы: першы - з 1569 г. да 1770-х гг., другі - з 1770-х да 1830-х гг. Храналагічна гэтыя этапы несуразмерныя, але для іх вылучэння ёсць падставы. У ходзе першага этапу развіваліся асноўныя кірункі бібліяграфічнай дзейнасці, закладзеныя ў папярэдні перыяд. На другім этапе кардынальна змяніўся падыход да кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю: былі здзейснены спробы надаць ёй дзяржаўны характар, увесці выкладанне бібліяграфіі на ўніверсітэцкім узроўні, а таксама з'явіліся новыя віды бібліяграфіі, у тым ліку краязнаўчая, якая на ўсіх наступных этапах была адным з найбольш устойлівых і дынамічных відаў.

У канцы XVIII ст. Эдукацыйнай камісіяй на дзяржаўным узроўні была праведзена рэформа бібліятэчнай справы, створана

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сетка публічных бібліятэк. Рэч Паспалітая сур'ёзна клапацілася аб развіцці адукацыі і выкарыстанні бібліятэчна-бібліяграфічных рэсурсаў для яе мэт. На тэрыторыі Беларусі сетку публічных бібліятэк узначальвала бібліятэка Галоўнай школы ВКЛ (да 1781 г. - Віленская езуіцкая акадэмія), нізавы ўзровень прадстаўлялі бібліятэкі навучальных устаноў, якія набылі функцыі публічных. Эдукацыйная камісія прыняла 19 афіцыйных дакументаў, прысвечаных пытанням бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці [3]. Важнейшымі задачамі, пастаўленымі камісіяй, былі стварэнне ва ўсіх навучальных установах бібліятэк, фонды якіх павінны адрозніваццa найлепшым складам аўтараў, і абавязковае вядзенне каталога. Для ўмоў таго часу каталагізацыя ў бібліятэках мела інавацыйнае значэнне. Акрамя таго, заканадаўча (1782) была прынята пастанова аб абавязковым экзэмпляры.

Аднак пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1794) усе вышэйпералічаныя пачынанні былі спынены.

Першыя дзесяцігоддзі ў складзе Расійскай Імперыі (да пачатку XIX ст.) - адзін з самых няплённых этапаў беларускай бібліяграфіі[1]. На фоне заняпаду былой Галоўнай школы ВКЛ, адтоку за мяжу значнай часткі шляхты бібліяграфічная прастора згортваецца, адбываецца натуральны спад бібліяграфічнай работы. Толькі новыя ініцыятывы ўлад у сферы адукацыі, што былі накіраваны на набыццё лаяльнасці мясцовай шляхты, і, безумоўна, ставілі мэтай падрыхтоўку спецыялістаў, якія засвоілі расійскую імперскую ідэалогію, прывялі да росту грамадскай патрэбнасці ў інфармацыі і ведах, што вывела бібліяграфію са стану заняпаду. Гэта перш за ўсё адкрыццё на кароткі час трох вышэйшых навучальных устаноў (ВНУ): Імператарскага Віленскага ўніверсітэта, Полацкай езуіцкай акадэміі і Горы-Горацкага земляробчага інстытута. Бібліятэкі ВНУ актывізавалі работу па каталагізацыі фондаў, стварэнні матэрыялаў бягучай бібліяграфічнай інфармацыі. Асобную ролю ва ўздыме бібліяграфічнай дзейнасці адыграла бібліятэка Імператарскага Віленскага ўніверсітэта, персанал якой у большасці складаўся з этнічных беларусаў (К. Контрым, С. Бакоўскі, Ш. Жукоўскі, А. Багаткевіч). У канцы перыяду ў Віленскім універсітэце на факультэце літаратуры і вольных мастацтваў у ліку дадатковых кафедраў была створана кафедра бібліяграфіі. Вучэбную дысцыпліну «Усеагульная бібліяграфія» ў 1829-1831 гг. выкладаў першы айчынны тэарэтык бібліяграфіі (ад'юнкт і памочнік бібліятэкара) А.М. Багаткевіч. Вынікі яго тэарэтычнага асэнсавання бібліяграфіі былі апублікаваны ў кнізе і часопісным артыкуле [4]. Ён падзяляў характэрныя для таго часу ўяўленні аб бібліяграфіі як надзвычай шырокай «навуцы ўменняў» і ведаў, якая павінна «дэманстраваць прагрэс чалавечага розуму», спалучаючы іх з улікам асаблівасцей бібліяграфічнай тэхналогіі. Гэта дапамагло яму раскрыць грамадскую карысць бібліяграфіі, яе значэнне ў захаванні і перадачы здабыткаў інтэлектуальнага развіцця, што вельмі сугучна нашым сённяшнім уяўленням аб ролі бібліяграфіі ва ўпарадкаванні інфармацыйных рэсурсаў у маштабах універсуму чалавечых ведаў.

Упершыню ў беларускай гісторыі, хоць і на кароткі перыяд, разам з практычнай бібліяграфічнай дзейнасцю функцыянавала і пазнавальная. На жаль, па суб'ектыўных і аб'ектыўных прычынах гэта пачынанне хутка прыпынілася.

Храналагічныя рамкі чарговага перыяду развіцця беларускай бібліяграфіі - 1830-я - 1920-я гг. Практычна да канца 1870-х гг. на стан бібліяграфіі, як і беларускай культуры ў цэлым, уплывалі вынікі трагічных падзей двух нацыянальна-вызваленчых паўстанняў (1830-1831 і 1863-1864). Жорсткія рэпрэсіі распаўсюдзіліся і на базавыя інстытуты бібліяграфіі. Знішчалася кніга на беларускай мове лацінскім шрыфтам, уніяцкія творы, былі канфіскаваны шматлікія бібліятэкі, закрыты кнігагандлёвыя ўстановы, а таксама ўсе ВНУ.

Такім чынам, у інстытуцыянальным аспекце бібліяграфія функцыянавала крайне слаба, у найпрасцейшых сваіх формах. Яна і не магла быць іншай. Адносіны да адукацыі на беларускіх землях ярка выявіў папячыцель Віленскай вучэбнай акругі І.П. Карнілаў у пісьме да інспектара А.І. Ішымавай ад 1 сакавіка 1865 г.: «Часопісаў не трэба; разнастайных загалоўкаў не трэба; патрэбна спыніць выбар на невялікай колькасці самых неабходных кніг і распаўсюджваць іх у мностве. Вось ваш каталог: Евангелле, малітваслоў, псалтыр, Свяшчэнная гісторыя, буквар царкоўна-грамадзянскі, кніга пад загалоўкам "Добрае чытанне для праваслаў-

[1] Гэта таксама адзін з найменш вывучаных этапаў беларускай бібліяграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных", брашура князя Львова пра Расію, а таксама "Масква, Кіеў і Варшава" і яшчэ "Кнігі для чытання", выдадзеныя пры Віленскай вучэбнай акрузе, і "Заходнерускі каляндар"» [5]. Зыходзячы з афіцыйных інтарэсаў, сярод мясцовага насельніцтва спрабавалі з дапамогай бібліяграфічных сродкаў паскорыць распаўсюджванне рускай мовы[2]. Характэрнымі для этапу сталі і забароненыя бібліяграфічныя матэрыялы. Тым вышэй можна ацаніць памкненні прагрэсіўнай нацыянальнай інтэлігенцыі падагуліць бібліяграфічнымі сродкамі развіццё беларускай кнігі, што праявілася ў першых спробах падрыхтоўкі нацыянальных рэтраспектыўных бібліяграфічных матэрыялаў (працы М. Пелка-Палінскага, А.К. Ельскага).

Чарговы этап дадзенага перыяду пачынаецца з ажыўлення бібліяграфічнай дзейнасці ў 1880-я гг., выкліканага некаторым нацыянальным і культурным уздымам. Бібліятэкі і дазволеная мясцовая прэса сталі асноўнымі каналамі вытворчасці і распаўсюджвання бібліяграфічнай інфармацыі. Бібліятэкі, у тым ліку галоўная афіцыйная ў Паўночна-Заходнім краі Віленская публічная бібліятэка (1867), абмяжоўваліся каталагізацыяй фондаў, але ўпершыню пачалі выдаваць друкаваныя каталогі[3].

Выдатныя вучоныя беларускага паходжання М.Ф. Доўнар-Запольскі, Я.Ф. Карскі, А.П. Сапуноў, якія працавалі ў розных універсітэтах Расіі, распрацоўваючы праблематыку беларусазнаўства і краязнаўства, аснашчалі свае работы вялікімі бібліяграфічнымі матэрыяламі [6].

У апошняй чвэрці XIX ст. павялічыўся выпуск краязнаўчых бібліяграфічных матэрыялаў, а таксама ўпершыню былі створаны фундаментальныя беларусазнаўчыя даследаванні з вялікім бібліяграфічным аснашчэннем (працы Я.Ф. Карскага). Выдатны вучоны, мовазнавец Я.Ф. Карскі грунтоўна адлюстраваў беларускамоўную рукапісную і друкаваную кнігу ў выпусках фундаментальнага даследавання «Беларусы». Тым самым была закладзена аснова нацыянальнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі.

Пасля атрымання права друку на мясцовых мовах (1905) у нацыянальным перыядычным друку і іншых выданнях з'явіліся бібліяграфічныя матэрыялы на беларускай мове. Гэта адна з важнейшых прымет узмацнення нацыянальнага характару бібліяграфічнай прасторы Беларусі.

Наступны перыяд развіцця беларускай бібліяграфіі мэтазгодна вылучаць з 1920-х гг., грунтуючыся на кардынальна новых з'явах у беларускай навуцы, культуры, адукацыі і бібліяграфіі як іх неад'емнай часткі (абавязковай для таго часу спадарожніцы). Падзеі першых двух дзесяцігоддзяў XX ст. (рэвалюцыі, грамадзянская вайна, замежная інтэрвенцыя на тэрыторыі Беларусі, розныя формы дзяржаўных утварэнняў, адчужэнне часткі беларускіх тэрыторый) зрабілі ўплыў на стан усіх сфер жыцця на тэрыторыі Беларусі, але да 1920-х гг. бібліяграфія развівалася па кірунках і ў арганізацыйных структурах папярэдняга перыяду. Развіццё любой формы дзяржаўнасці (Беларускай Народнай Рэспублікі, Літоўска-Беларускай ССР. БССР) прывяло б, безумоўна, да якасных змен у арганізацыі бібліяграфіі, з'яўлення новых відаў бібліяграфічнай прадукцыі і другіх бібліяграфічных з'яў, якія б дазволілі вылучыць новы перыяд у развіцці беларускай бібліяграфіі. У 1920-я - 1930-я гг. разам з працэсамі тэрытарыяльнага вылучэння Беларусі ў складзе СССР (частка тэрыторыі ўваходзіла ў склад Другой Рэчы Паспалітай Польскай) актыўна развіваліся працэсы нацыянальнага адраджэння, фарміраваліся сістэмы нацыянальнай навукі і адукацыі. Гэтыя акалічнасці і шэраг іншых (напрыклад, паступовае распаўсюджванне камандна-адміністрацыйных форм кіравання) паўплывалі на развіццё бібліяграфічнай дзейнасці ў цэлым, станаўленне і асаблівасці функцыянавання бібліяграфічных цэнтраў, некаторых відаў бібліяграфіі, абумовілі склад суб'ектаў бібліяграфічнай дзейнасці, лёсы асобных яе прадстаўнікоў.

Бібліяграфічная дзейнасць на тэрыторыі Беларусі ў гэты перыяд набыла дзяржаўны характар, былі створаны адпаведныя арганізацыйныя структуры, вызначаны кірункі бібліяграфічнай работы ў бібліятэках, навуковых і вучэбных установах. Знакавай

Так, у 1849 г. быў выдадзены каталог «Роспись русских книг Минской губернской библиотеки для чтения», у прадмове да якога адзначана: «Для распространения в здешнем крае охоты к отечественной русской словесности н для усовершенствования в знании русского языка между здешними чиновниками».

[3] Яны ўлічаны ў бібліяграфічных паказальніках «Дооктябрьская книга на русском языке о Белоруссии» (1976) А.А. Сакольчыка, «Кніга Беларусі» (1986).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падзеяй стала ўтварэнне Дзяржаўнай бібліятэкі і Кніжнай палаты (1922) у яе складзе як базавых звёнаў беларускай бібліяграфіі. Гэтыя цэнтры сталі істотна ўплываць як на ўдасканаленне інфармацыйна-бібліяграфічнага забеспячэння грамадства, так і на працэсы інстытуцыяналізацыі беларускай бібліяграфіі. Упершыню была ўведзена дзяржаўная рэгістрацыя твораў друку, што стала падставай для фарміравання сістэмы паказальнікаў дзяржаўнай бібліяграфіі пад агульнай назвай «Летапіс беларускага друку» (сёння «Летапіс друку Беларусі»), Выдатную ролю ў станаўленні бібліяграфічнай дзейнасці Дзяржаўнай бібліятэкі і Кніжнай палаты і бібліяграфіі ў цэлым адыграў І.Б. Сіманоўскі. На фоне нацыянальна-дзяржаўнай ідэнтыфікацыі і інтэнсіўнага развіцця беларускай навукі і адукацыі сталі актыўна развівацца навукова-дапаможная, рэкамендацыйная і краязнаўчая віды бібліяграфіі. Дзяржаўная бібліятэка здзейсніла спробу выпуску нацыянальных рэтраспектыўных бібліяграфічных паказальнікаў. Адметнай рысай таго часу быў актыўны ўдзел вучоных у стварэнні бібліяграфічнай прадукцыі і папулярызацыі літаратуры, ведаў беларусазнаўчага і краязнаўчага характару [7]. У 1920-х - 1930-х гг. азначылася бібліяграфічная дзейнасць беларусаў, якія апынуліся за межамі рэспублікі. Галоўным дасягненнем гэтага часу стала праца В.Ю. Ластоўскага «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі», у якой быў здзейснены бібліяграфічны ўлік рукапісных і друкаваных беларускіх дакументаў з X да XVIII ст.

Перыяд з чэрвеня 1940 г. па 1950-я гг. - адзін з найбольш трагічных і цяжкіх у гісторыі беларускай бібліяграфіі. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўся тэрыторыя Беларусі была акупіравана і, адпаведна, бібліяграфічныя арганізацыйныя структуры разбураны, быў спынены выпуск бягучых бібліяграфічных дапаможнікаў, вывезены, часткова знішчаны бібліятэчныя фонды. Загінулі або страцілі адпаведнасць фонду каталогі.

Пасля вызвалення беларускіх тэрыторый пачало адбывацца паступовае разгортванне дзейнасці арганізацыйных структур і цэнтраў, якія былі закладзены ў папярэдні перыяд (даваенны час) і захаваліся да 1940-х гг., аднаўленне крыніц дзяржаўнай бібліяграфіі і інфармацыйна-пошукавага апарату бібліятэк, развіццё краязнаўчага і рэкамендацыйнага відаў бібліяграфіі, станаўленне бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі. З кастрычніка 1944 г. пачалася падрыхтоўка кадраў бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі.

Якасна новы этап у развіцці беларускай бібліяграфіі наступіў у 1960-х гг., калі на саюзным і рэспубліканскім узроўнях сталі рэалізоўвацца афіцыйныя рашэнні, якія ўпарадкоўвалі бібліятэчную сетку і навукова-інфармацыйную сістэму на розных узроўнях і рэгламентавалі кірункі іх дзейнасці, у тым ліку і бібліяграфічны. Былі прыняты таксама афіцыйныя дакументы, якія датычыліся навукова-дапаможнай і рэкамендацыйнай бібліяграфіі.

У гэты перыяд была ўпарадкавана і значна ўзмоцнена арганізацыйная структура бібліяграфіі, у шэрагу буйных бібліятэк з'явіліся бібліяграфічныя аддзелы, Кніжная палата стала самастойнай установай, былі створаны аддзелы навуковай інфармацыі пры акадэміі навук, аддзелы навуковай інфармацыі па культуры і мастацтву, сістэма органаў навукова-тэхнічнай інфармацыі. Гэта быў самы плённы перыяд у развіцці сістэмы крыніц бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі (павялічыўся іх пералік, былі аптымізаваны метадычныя падыходы), пачалі выдавацца зводныя бібліяграфічныя паказальнікі і крыніцы рэпертуарнай бібліяграфіі. Дынамізмам характарызуецца развіццё спецыяльнай бібліяграфіі: сталі выходзіць бягучыя паказальнікі па эканоміцы, тэхніцы, медыцыне, мове, літаратуры, праве, краязнаўстве (па кожнай вобласці) і іншыя; выпускаліся рэтраспектыўныя агульнагалінovыя, тэматычныя і краіназнаўчыя паказальнікі. Інтэнсіўна развівалася рэкамендацыйная бібліяграфія. Упершыню ў гісторыі беларускай бібліяграфіі стабільна вялася падрыхтоўка кадраў бібліятэкараў-бібліёграфаў, а ў галіне бібліяграфічнай навукі ўзніклі навукова-даследчыя структуры, сфарміраваўся кантынгент навукова-педагагічных кадраў, з'явіліся айчынныя навуковыя выданні (міжведамасны зборнік «Вопросы библиографоведения и библиотековедения»), У навукова-адукацыйным працэсе вядучая роля належала кафедры бібліяграфіі (назвы і склад бібліяграфічных кафедраў змяняўся) Мінскага педінстытута імя М. Горкага, а з 1975 г. Мінскага інстытута культуры. Першая кандыдацкая і доктарская дысертацыі ў галіне бібліяграфіі былі абаронены В.Е. Лявончыкавым, які выпусціў таксама манаграфічныя выданні і падручнікі для вышэйшых навучальных устаноў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Узмацніліся бібліяграфічныя цэнтры беларускага замежжа, асабліва Беларускі інстытут навукі і мастацтва (Нью-Ёрк), які вёў актыўную работу па бібліяграфічным рэтраспектыўным уліку выданняў беларускага замежжа і навукова-дапаможнай бібліяграфіі (паказальнікі Вітаўта і Зоры Кіпель і інш.)[4].

З 1990-хгг. пачынаецца новы (сучасны) перыяд развіцця беларускай бібліяграфіі. Беларусь стала незалежнай дзяржавай і атрымала магчымасць развіваць нацыянальныя арганізацыйныя структуры [8], у тым ліку бібліяграфічныя. Вядучым у розных сферах дзейнасці ўстановам, у тым ліку Дзяржаўнай бібліятэцы, Кніжнай палаце, Дзяржаўнаму архіву быў нададзены статус нацыянальных. Створаны або пераўтвораны на базе арганізацый, якія існавалі раней, установы нацыянальнага ўзроўню (Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі, Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці, Інстытут прыкладных праграмных сістэм, Беларускі інстытут сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы), дзейнасць якіх звязана з дзяржаўнай рэгістрацыяй асобных відаў дакументаў (афіцыйных дакументаў, патэнтаў, навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх і вопытна-тэхналагічных работ, электронных інфармацыйных рэсурсаў і інш.) і вядзеннем адпаведных баз даных. Новы імпульс у развіцці атрымала беларусазнаўчая, краязнаўчая і нацыянальная бібліяграфія, а таксама нацыянальная сістэма навуковай і адукацыйнай дзейнасці ў галіне бібліяграфіі.

Укараненне камп'ютарных тэхналогій у дзейнасць розных устаноў інфармацыйнай сферы закранула перш за ўсё бібліяграфічныя працэсы. Сталі стварацца на якасна новым узроўні інфармацыйна-пошукавыя сістэмы, у тым ліку на карпаратыўнай аснове, а таксама іншыя бібліяграфічныя прадукты і паслугі. У дзейнасці бібліятэк пачалі актыўна выкарыстоўвацца віртуальныя даведачныя службы і сэрвісы розных сусветных вытворцаў інфармацыйных рэсурсаў і стварацца ўласныя. Бібліяграфічная прадукцыя бібліятэк арыентавана на міжнародныя стандарты прадстаўлення запісаў і інтэграванне ў сусветную інфармацыйную прастору.

[4] Па ідэалагічных прычынах набыткі бібліяграфіі беларускага замежжа доўгі час (у перыяд існавання БССР) не лічыліся часткай нацыянальнай бібліяграфічнай сістэмы.

Падобныя тэндэнцыі назіраюцца і ў функцыянаванні іншых сацыяльных інстытутаў, якія фарміруюць бібліяграфічную прастору Беларусі.

Узмацніўся навукова-адукацыйны патэнцыял беларускай бібліяграфіі. Упершыню ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў быў створаны спецыялізаваны савет па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, пачала функцыянаваць магістратура. Актывізаваўся выпуск айчынных падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і слоўнікаў, якія адлюстроўвалі і аспекты развіцця айчыннай бібліяграфіі.

Змянілася стаўленне да бібліяграфічнай дзейнасці беларусаў замежжа. Замежная бібліяграфія пачала разглядацца ў кантэксце агульнага развіцця беларускай бібліяграфіі як неад'емны кампанент агульнанацыянальнай бібліяграфічнай спадчыны.

Вышэйпрапанаваныя падыходы да перыядызацыі гісторыі беларускай бібліяграфіі дазваляюць убачыць унутраную дынаміку асноўных бібліяграфічных з'яў, якія вялі да росту і разгалінавання нацыянальнай бібліяграфічнай сістэмы, у кантэксце асаблівасцей гісторыка-культурнага развіцця беларускага грамадства і станаўлення нацыянальнай дзяржавы.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Лявончыкаў, В. Е.** Беларуская бібліяграфія : агульны курс : падручнік па снецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» / **В.** Е. Лявончыкаў. Мінск : Вышэйшая школа, 1991. 262 с. ; **Симановский, И. Б.** Белорусская советская библиография. Ч. 1 / И. Б. Симановский. Минск : [б. п.]. 1965. 191 с.
2. **Саітава, В.** І. Бібліяграфія на беларускіх землях як частка інфармацыйных нрацэсаў у другой палове XV - XVIII ст. / В. І. Саітава, Т. В. Страмужэўская // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі. Мінск, 2007. Вып. 9. С. 25-40.
3. **Zarzębski, T.** Polskie prawo biblioteczne 1773–1990 / Tadeusz Zarzębski ; Biblioteka Narodowa, Instytut książki i czytelnictwa. Warszawa : Biblioteka Narodowa, 1991. 312 s.
4. **Саітава, В. І.** Вытокі айчыннай бібліяграфічнай адукацыі і бібліяграфазнаўства / В. І. Саітава // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. 2005. № 4. С. 97–105.
5. **Лявончыкаў, В. Е.** Беларуская бібліяграфія : агульны курс … С. 64.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. **Кузьмініч, Т. В.** Творы па гісторыі Беларусі як крыніца выяўлення першапачаткова фіксаваных форм бібліяграфічнай інфармацыі / Т. В. Кузьмініч // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі. Мінск, 2001. Вып. 4. С. 5-22.

7. **Кузьмініч, Т. В.** Бібліяірафічная праца навуковага таварыства па вывучэнні Беларусі ў кантэксце інфармацыннай дзейнасці ў рэспубліцы (другая палова 20-х - пачатак 30-х гг. XX ст.) / Т. В. Кузьмініч // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Мінск, 2006. Вып. 8. С. 204-228 ; **Лявончыкаў, В.** Дзейнасць Бібліяграфічнай камісіі Інстытута беларускай культуры / В. Лявончыкаў, Н. Карасцінская // Бібліягэчны свет. 1997. № 1 С. 8-9.

8. **Долгополова, Е.** Информационные ресурсы Национальной библиотеки Беларуси : проблемы корпоративного формировання и использования / Е. Долгополова, Т. Кузьминич // Бібліятэчны свет. 2007. № 3. С. 15-18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ